звонку выдае на мужчыну, але няздольная ні праліць жыцьцядайнае семя, ні прыняць яго ў сябе.

І я б вокамгненна зьмяніў яе на іншую, каб праз перамену мэтафараў можна было вярнуць жыцьцядайнасьць зьнявечанаму *мэліярацыяй* чэраву краіны, якую Багушэвіч калісьці назваў жаночым імем Беларусь.

# Мэтро

***Зьміцер Бартосік***

У перакладзе з грэцкай мовы слова *metropolis* азначае горад-маці. Ці сталіца. Францускі выраз chemin de fer *métropolitain*, сталічная чыгунка, зь цягам часу скараціўся да проста *„мэтрапалітэну“*. У 1984 годзе сваё *мэтро* зьявілася і ў Менску.

А першы ў сьвеце *мэтрапалітэн* быў адкрыты ў Лёндане, тады, калі пад Менскам ішлі баі паміж паўстанцамі Каліноўскага й расейскай арміяй. Цяжка спалучыць гэтыя падзеі ў адным часе: заклік „У нас няма дваран“ і абвестку „Асьцярожна! Дзьверы зачыняюцца“ — такую, здаецца, далёкую гісторыю і такі сучасны від транспарту.

У XX стагодзьдзі *мэтро* разглядалася ня толькі як зручны транспарт. Гэта быў яшчэ і моцны сродак савецкай манумэнтальнай прапаганды. Ад „Плошчы Леніна“ мы праз „Кастрычніцкую“ ехалі да канечнай станцыі „Маскоўская“ і ганарыліся сваёй далучанасьцю да клюбу мэгаполісаў. Да букету менскага паветра дадаўся цёплы, смалісты пах шпалаў, а ў лексыкон менчукоў паступова ўваходзілі новыя фразы: „Сустрэнемся ў *мэтро*“, „Трэба пасьпець на апошні цягнік“, „Ля якой станцыі Вы жывяце?“.

З набыцьцём незалежнасьці была нават ідэя, што мэтро аўтаматычна станецца прапагандыстам беларушчыны. Але станцыяў „Кальварыйская“ або „Цівалі“ мы так і не дачакаліся. Ня стала нашае *мэтро* й дзейснаю базаю незалежнага прафсаюзнага руху.

Паводле былых савецкіх плянаў сёлета мусіла запрацаваць трэцяя, апошняя лінія. Але *мэтро* — штука дарагая. Асабліва пры кошце праезду ў пару амэрыканскіх цэнтаў. Можа, менавіта на трэцяй лініі мы калі-небудзь пачуем: „Станцыя „Каліноўская“. Наступная станцыя — „Плошча 25 сакавіка“. Каб ужо ніколі не праехаць паўз сваё.

# Мяжа

***Ігар Бабкоў***

Слова *мяжа* набыло сваё сучаснае значэньне толькі ў XX стагодзьдзі. Раней у значэньні яго ўжываліся словы „рубеж“ і „граніца“. *Мяжа*, паводле Ластоўскага, усяго толькі неўзараная паласа зямлі, якая падзяляе ральлю.

Для сёньняшняга беларускага вуха слова *мяжа* гучыць амаль што трагічна. *Межы* Беларусі дасюль няпэўныя і неабароненыя. Мы фатальна *адмежаваныя* ад Захаду. На гэтым кірунку стаяць *памежныя* слупы й бытуюць *памежнікі*. Мы ўсё яшчэ знаходзім сябе на *памежжы* між Захадам і Ўсходам. Апазыцыя *разьмежаваная*. Яе лідэры *абмежаваныя* ў рэсурсах..

У XX стагодзьдзі *межаў* было зашмат. Іх сьціплы пералік дасюль застаец-